**Вашкевіч, А.** Мужнелі пад кулямі / А. Вашкевіч // Лепельскі край. — 2002. — 15 лют. — С. 1.

## МУЖНЕЛІ ПАД КУЛЯМІ

Пяць «афганцаў» працуюць у ДРБУП-202.

Сяргей Шляжко пасля СШ па накіраванні ваенкамата скончыў курсы ДТСААФ, вывучыўся на вадзіцеля. Ва Узброеныя Сілы СССР прызваны ў 1984 годзе. Пасля шасцімесячнай вучэбкі трапіў у Афганістан.

– Перазозілі грузы (боепрыпасы, прадукты харчавання), – успамінае Сяргей. – Рухаліся калонамі пад аховай. На дарогах падпільноўвалі духі. Звярыны ў духаў быў закон: забіў шураві (савецкага) значыць, нейкі іх бог адпусціць грахі, а дух атрымае і грашовую ўзнагароду.

Духі стралялі трапна, як правіла, з засады. На маіх вачах загінула некалькі сяброў-саслужыўцаў. Мяне куля абмінула.

Леанід Бартко пайшоў служыць у 1983 годзе. Перад гэтым скончыў СПТВ. Вучэбка. Кароткія зборы па трывозе. Адрас прызямлення: Кундуз. Спачатку служыў у стралковай роце, потым у разведузводзе. Узнагароджаны двума медалямі «За адвагу».

Аўтакалона перавозіла чарговую партыю грузаў. Наперадзе ішлі сапёры з мінашукальнікамі. За імі – снайперы. У ліку апошніх – Бартко. За чарговым паваротам звілістай горнай дарогі – засада. Духі стралялі з усіх бакоў. Гіне малады салдат-кулямётчык. Ствараецца крытычная сітуацыя. Выручае смеласць і знаходлівасць Леаніда Бартко. Ён кідаецца да кулямёта. Трапныя чэргі суцішаюць духаў.

Жылі ў вёсцы Кабак два сябры: Сяргей і Дзмітрый Аўтухі. Першы пайшоў служыць на год раней. Абодва трапілі ў Афганістан. Сяргей загінуў. Пад цяжкім гранітам спачывае ён на вясковых могілках.

– Сяргей мне пісаў «засакрэчаныя» пісьмы. Аднак я разумеў, што ён ваюе. У ваенкамаце сказаў: хачу быць там, дзе брат. Прайшоў курс маладога байца, потым салдацкая дарога прывяла ў Афган.

Дзмітрый расказвае пра адну з многіх аперацый:

– Як правіла, зачыстку рабілі афганскія воіны. Мы іх суправаджалі. Заданне выканана. Адыходзім. Нечакана з «зялёнкі» абрушваецца прыцэльны агонь. Камандзір крычыць: «Да кулямёта!» Пакасіў я тады духаў, адпомсціў за Сяргея.

За праяўленую храбрасць у гэтым баі Д. Аўтух узнагароджаны медалём «За адвагу».

– У пачатку вайны закінулі ў Афганістан майго старэйшага брата, потым сярэдняга, – прыгадвае Вашкевіч Васіль – Пабываў і я на той вайне.

У Кабул мы прыляцелі на самалёце. Перад гэтым я скончыў вучэбку ў Фергане. Вадзіў КамАЗ «Ураган». Галоўнай задачай нашай часці была перавозка грузаў з Хаўратонскай базы. Рухаліся, як правіла, калонамі. Першы выезд запомніўся на ўсе жыццё. Увайшлі ў горы. Ціха. Рухаемся далей. Раптам з-за камянёў душманы адкрываюць шквальны агонь. Загарэлася падбітая з гранатамёта галаўная машына калоны. Камандзір не разгубіўся. Ён аддаў загад: спіхнуць падбітую машыну ў бездань, прарывацца. Гэта нас выратавала ад поўнага знішчэння.

За ўдзел у гэтай аперацыі мяне ўзнагародзілі медалём «За адвагу».

Дзеравяга Мікалай быў старшыной танкавай роты. Афган запомніўся не толькі баямі, а і раненнямі. Першае атрымаў у галаву, другое – у правую нагу. Душман прастрэліў яе навылёт.

...Вайна – гэта не ўзнёслая рамантыка. Гэта кроў, смерць. Хлопцы прайшлі яе ў няпоўныя 20 гадоў.

Аб'ядноўвае афганцаў і праца ў адным калектыве. Сяргей Шляжко працуе прарабам, Леанід Бартко – экскаватаршчыкам, Васіль Вашкевіч – вадзіцелем спецаўтамабіля, Дзмітрый Аўтух – токарам, Мікалай Дзеравяга – рамшчыкам.

– Дысцыплінаваныя і руплівыя хлопцы. У іх паводзінах адчуваецца баявая загартоўка, – сказаў галоўны інжынер ДРБУП-202 Міхаіл Шляжко.

* * *

Як паведаміў старшыня раённага савета Беларускага саюза ветэранаў В. М. Пятунін, у інтэрнацыянальных войнах прымалі ўдзел 270 лепяльчан, 10 з іх загінулі. Па добраму хрысціянскаму абраду памянём Васіля Іванавіча Жарнасека, Сяргея Уладзіміравіча Аўтуха, Ігара Аляксандравіча Салаўёва, Уладзіміра Іванавіча Садоўскага, Ігара Анатольевіча Нападоўскага, Аляксандра Міхайлавіча Аўгусціновіча, Сяргея Антонавіча Спірыдовіча, Міхаіла Міхайлавіча Жарнасека, Івана Паўлавіча Воюша, Івана Данілавіча Лапаухава.

**А. Вашкевіч**